# «Беларускі мёд» з парыжскага «Вулея»

*13 студзеня адзначаецца 130-годдзе з дня нараджэння Хаіма Суціна, нашага славутага земляка са Смілавічаў, аднаго з найбольш выбітных, яскравых, непаўторных прадстаўнікоў знакамітай Парыжскай школы. Цікавасць да яго асобы, жыцця і творчасці ўвесь час расце: яго карціны паспяхова прадаюцца на аўкцыёнах, яму прысвячаюцца шматлікія выставы, пленэры, навуковыя канферэнцыі, пра яго пішуць артыкулы і кнігі... Лёс мастака ахутаны легендамі, незвычайнымі гісторыямі, якія яшчэ больш прыцягваюць увагу да яго. Пазнаёміцца з творчасцю Хаіма Суціна і іншых таленавітых прадстаўнікоў Парыжскай школы запрашае віртуальны праект «Парыжскі "Вулей": сусветна вядомыя мастакі з Беларусі» на інтэрнэт-партале Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.*





Парыжскі «Вулей»

Парыжская школа – гэта ўнікальнае сузор'е вялікіх мастакоў, умоўная назва для пакаленняў творцаў, якія жылі і працавалі ў Парыжы з 1900-га да 1960-х гадоў. Сярод іх – вядомыя на ўвесь свет імёны: Пабла Пікаса, Амедэя Мадыльяні, Піт Мандрыян, Дыега Рывера, Фернан Лежэ, Васіль Кандзінскі, Наталля Ганчарова, Міхаіл Ларыёнаў, Марк Шагал... Мастацтвазнаўцы даўно прыйшлі да высновы, што Парыжская школа ў выяўленчым мастацтве – гэта не напрамак і не стыль, а гістарычны факт.

У пачатку XX стагоддзя Парыж лічыўся сталіцай сусветнага мастацтва і прыцягваў творцаў з розных краін, у тым ліку з Беларусі. Менавіта для мастакоў у 1902 годзе скульптар Альфрэд Бушэ стварыў будынак пад назвай «Віла Медычы», які складалі майстэрні і жылыя памяшканні. Згодна з вобразам будынка, асаблівасцямі яго знешняй канструкцыі самі мастакі пазней назвалі яго «Вулей», які з 1905-га па 1930-я гады з'яўляўся цэнтрам артыстычнага жыцця не толькі Парыжа, але і ўсёй Еўропы. Да сённяшняга часу гэты ўнікальны будынак застаецца месцам прыцягнення аматараў мастацтва з усяго свету.

Жыццё рознымі шляхамі прывяло кожнага з беларускіх мастакоў у французскую сталіцу, розныя лёсы напаткалі іх, але аб'ядноўвала барацьба за выжыванне, падтрымка адно аднаго і ўнікальная атмасфера творчага спаборніцтва, што панавала ў «Вулеі». Перадольваючы голад і хваробы, матэрыяльную нястачу і бытавыя цяжкасці, драмы кахання і крызісы творчасці, яны змаглі стаць у адзін шэраг з карэннымі французамі, а вядомая Парыжская школа ўзбагацілася нацыянальнымі адценнямі. Сёння, акрамя вядомых Марка Шагала, Хаіма Суціна, Шрагі Царфіна, свету адкрыліся імёны Восіпа Цадкіна, Міхаіла Кікоіна, Пінхуса Крэменя, Восіпа Любіча, Яўгена Зака, Якава Балглея, Роберта Геніна. Гэтыя асобы і іх творчасць усё больш прыцягваюць увагу сусветных і беларускіх мастацтвазнаўцаў і калекцыянераў.



«Чырвоная лесвіца ў Кань»

Тэрмін «Парыжская школа» ўпершыню ўвёў мастацкі крытык Андрэ Варно, які ў сваёй кнізе «Колыбель молодой живописи: Парижская школа» (1925) пісаў: *«Парижская школа существует. Позднее историки искусства смогут лучше нас определить её характер и изучить элементы, из которых она состоит»*.

Сёння нельга не пагадзіцца з гэтай думкай: творчасць мастакоў Парыжскай школы даследавана як сусветнымі, так і айчыннымі навукоўцамі, у гонар гэтых асоб названы вуліцы, адкрыты музеі і галерэі, праходзяць пленэры, выставачныя праекты, арганізуюцца канферэнцыі, выдаюцца кнігі, здымаюцца фільмы, ладзяцца тэатральныя пастаноўкі, збіраецца і захоўваецца іх спадчына...

У віртуальнай экспазіцыі «Парыжскі "Вулей": сусветна вядомыя мастакі з Беларусі» прадстаўлены матэрыялы як пра знакамітых, так і пра менш вядомых творцаў, сярод якіх Роберт Генін, Пінхус Крэмень, Восіп Любіч і інш. Галерэя найбольш значных твораў майстроў, фотаздымкі, літаратура з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, а таксама цікавыя факты, цытаты, успаміны і выказванні сучаснікаў, сяброў, жыхароў знакамітага будынка «Вулей» даюць магчымасць уявіць, якімі таленавітымі і неардынарнымі асобамі яны былі. Сярод кніжных рарытэтаў экспазіцыі прыжыццёвае выданне Андрэ Варно пра мастакоў Манмартра «Les peintres de Monmartre» (1928) з дароўным надпісам аўтара да пісьменніка, літаратурнага крытыка і журналіста Морыса Монда.

Спадзяемся, што карыстальнікі адкрыюць для сябе новыя імёны, а таксама знойдуць мастака, творчасць якога будзе ім даспадобы і надоўга застанецца ў памяці.

Парыжскую школу нельга ўявіць без нашых суайчыннікаў, якія прынеслі ў яе вялікую долю ўласнай эстэтыкі. Вобразна і яскрава пра іх унёсак у сусветнае мастацтва напісаў вядомы даследчык і крытык Уладзімір Шчасны: *«Мёд, принесённый в парижский "Улей" из Беларуси, собирался с разных цветов. Они не были яркими, но запах неприметных на первый взгляд растений вересковых равнин всегда стоек, ведь каждое из них имеет свой особенный аромат. И собранный с них мёд не бывает приторным. Он всегда немного горчит. Воздух Парижа сделал его ещё терпким»*.

А з 13 студзеня па 20 лютага ў зале дакументаў па мастацтве Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі працуе кніжная выстаўка «Вялікі дзівак са Смілавічаў», прысвечаная 130-годдзю з дня нараджэння Хаіма Суціна.

**Юлія АМОСАВА**